Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская


№29 (267) 18 — 24 ЛІПЕНЯ 2002Г. НАКЛАД 11.000 ЭКЗ. КОШТ 250 РУБ.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ

Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы і іншыя гарады Беларусі

на HTTP://gs.promedia.by

СПЯКОТНЫ ЛІПЕНЬ



Фота IREX/ProMedia

Курсы обмена валют в г. Слониме по состоянию на 9[50] 16 июля 2002г.

"Беларусбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	1815	1850
1 EURO	1800	1840
1 RUR	56	58
ОАО "Белпромстройбанк	**Покупка**	**Продажа**
1 USD	1815	1840
1 EURO	1800	1850
1 ZL	425	455
1 RUR	56,5	58
"Белагропромбанк"	**Покупка**	**Продажа**
1 USD	1820	1840
1 EURO	1760	1810
1 RUR	54	58
Нацбанк РБ		
1 USD	1815	
1 EURO	1807,65	
1 RUR	57,63	

НАВІНЫ

НА СЛОНІМШЧЫНЕ РАСЦЕ КОЛЬКАСЦЬ ВІЧ-ІНФІЦЫРАВАНЫХ

Першы ВІЧ-інфіцыраваны ў Слоніме быў выяўлены ў мінулым годзе. А ўжо сёлета ў нашым раёне, як сказаў намеснік галоўнага ўрача Слонімскага медаб'яднання Юрый Запрагаеў, зарэгістраваны 21 ВІЧ-інфіцыраваны.

Асноўнымі прычынамі заражэння ВІЧ-інфекцыяй з'яўляецца ўнутрывеннае ўвядзенне наркотыкаў. Але ў апошні час расце колькасць людзей якія становяцца носбітамі ВІЧ-інфекцыі ў выніку палавых кантактаў. І гэта небяспека датычыць усяго насельніцтва, а не толькі тых, хто адносіцца да групы рызыкі: наркаманы, прастытуткі і гомасексуалісты.

На адной з апошніх прэс-канферэнцый у Мінску галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра прафілактыкі СНІД Лілія Мялешка адзначыла, што на сённяшні дзень у Беларусі зарэгістраваны 4344 ВІЧ-інфіцыраваных. А распаўсюджванне інфекцыі сярод жанчын прыводзіць да росту колькасці дзяцей, народжаных ад ВІЧ-інфіцыраваных матуль. Усяго ў нашай краіне нарадзілася 229 такіх дзяцей, у тым ліку — 10 за першыя тры месяцы гэтага года. На сённяшні дзень дыягназ "ВІЧ-інфекцыя" пастаўлены 23 дзецям, народжаным ад інфіцыраваных маці. Усяго ў Беларусі зарэгістравана 30 ВІЧ-інфіцыраваных ва ўзросце да 14 гадоў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ДАЯРКІ СТАВЯЦЬ УЛЬТЫМАТУМ

Даяркі з фермы вёскі Ягнешчыцы, што ў калгасе "1 Мая", 11 ліпеня на паўтары гадзіны аб'явілі забастоўку, у выніку чаго парушыўся графік дойкі кароў.

Жанчыны патрабавалі аднаго — выплаты заробку, які ім не плацяць ужо два месяцы. Калі ж да панядзелка 15 ліпеня грошы не выплацяць, даяркі пагражалі не выйсці на працу наогул.

У панядзелак карэспандэнт "ГС" звязаўся па тэлефоне з фермай у Ягнешчыцах, дзе яму паведамілі, што даяркам выплацілі па 30 тысяч рублёў з запазычанасці па зарплаце і грашовую дапамогу на дзяцей. Такім чынам адміністрацыі гаспадаркі ўдалося пазбегнуць забастоўкі. Трэба адзначыць, што падобны выпадак ужо меў месца на ферме калгаса імя Леніна, дзе запазычанасць па зарплаце таксама была часткова ліквідавана.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

"СКАЛАЛАЗ" З БРЭСЦКАЙ ВУЛІЦЫ

Жыхар аднаго з інтэрнатаў, які знаходзіцца на Брэсцкай вуліцы, вырашыў пералезці па вяроўцы з чацвёртага паверха на трэці.

На жаль, утрымацца падвіпіўшаму мужчыне на вышыні не ўдалося. Ён сарваўся і паляцеў уніз. З сур'ёзнымі траўмамі "скалалаз" быў дастаўлены ў бальніцу.

Сяргей ЧЫГРЫН

У АГНІ ЗАГІНУЎ КЛАДАЎШЧЫК

Вечарам, 9 ліпеня, на складзе тары Слонімскага кардонна-папяровага завода адбыўся пажар.

Агонь знішчыў не толькі тое, што знаходзілася на складзе, але пры яго тушэнні загінуў 53-гадовы кладаўшчык.

Сяргей ЧЫГРЫН

ГОРАД

ТОРГОВЛЯ на человеческих черепах

2 июля во время строительных работ по реконструкции Слонимского городского рынка, построенного на месте еврейского кладбища 17-го века, рабочие-экскаваторщики откопали два человеческих черепа.



Об этом корреспонденту "ГС" сообщили торговцы продуктами, чьи лотки расположены недалеко от места проведения реконструкции.

Однако директор рынка Геннадий Красочка отрицает то, что эти черепа были раскопаны именно на рынке.

По словам очевидцев, которые запечатлели происходящее на фотопленку, во время работы экскаваторщиков, вместе с песком в одну кучу выгрузили два человеческих черепа. Впоследствии, как говорит продавец А., которая пожелала остаться неизвестной, раскопанные останки рабочие положили в подсобное помещение рынка.

"Я еще тогда возмутилась, мол, как это можно человеческие черепа выбрасывать, — рассказывает А., — однако никто меня не слушал. А самой было как-то боязно забрать черепа и закопать их в другом месте".

Как отмечает историк Игорь Подгородецкий, в 17 веке возле синагоги было большое еврейское кладбище, которое действовало почти до 1945 года. Во время войны там хоронили убитых евреев. Поэтому, по предположению Игоря Ивановича, есть большая вероятность того, что раскопанные черепа датируются военным временем.



Раввин из Пинска Мойша Фима копает могилу, чтобы захоронить останки

"Еще моя бабушка помнит, как в 1944 году в Слониме расстреливали евреев. Трупов было так много, что их просто не успевали закапывать, они лежали по всему городу", — говорит Игорь Подгородецкий.

В прошлое воскресенье люди, работающие на строительстве нового городского рынка, передали корреспондентам "ГС" раскопанные черепа. "Нужно их похоронить, а то как-то не по-человечески получается", — сказали они. А в связи с незнанием еврейских обрядов захоронения они и передали черепа в редакцию "ГС" с мотивацией "корреспонденты должны знать все".

Для погребения этих останков исполнительный директор проекта по сохранению еврейского наследия в восточной Европе Френк Шварц назначил раввина из Пинска.

Два раскопанных черепа на восьмой день пинский раввин Мойша Фима захоронил на еврейском кладбище, расположенном возле СШ №10.

Ольга ШИНКЕВИЧ (фото автора)

ПРАБЛЕМА

ЛЮДЗІ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ ВАДЫ

У рэдакцыю "ГС" патэлефанавалі жыхары вёскі Бракава, якая належыць да ўнітарнага сельгаспрадпрыемства "Пераможац" і расказалі пра сваё даўно набалелае.

Справа ў тым, што ў гэтай вёсцы, дзе прыкладна 90 двароў, вельмі мала калодзежаў. Калодзежы старыя і нячышчаныя, таму ў спёку, якаяназіраецца апошнім часам, яны практычна перасыхаюць. Праз вёску праходзіць вадаправод, і праблема магла б быць вырашана. Але менавіта ў гарачае надвор'е вада тоненькім струменем цячэ долькі з дзвюх калонках у пачатку вёскі, а ў астатніх яе проста няма. Вяскоўцы сцвярджаюць, што неадназарова звярталіся да дырэктара "Пераможца" Уладзіміра Камежука з просьбай не пакідаць іх без вады ў спякотныя дні, не адключаць вёску ад воданапорнай вежы, але кіраўнік гаспадаркі тлумачыць адсутнасць вады ў калонках неабходнасцю эканоміць электраэнергію. І на працягу апошніх пяці гадоў ваду у летнюю пару на нейкі час падаюць толькі пасля скаргаў жыхароў у выканкам альбо ў мясцовую санэпідэмстанцыю. А потым яна зноў знікае.

У размове з карэспандэнтам "ГС" вяскоўцы сказалі, што згодныя нават плаціць за ваду грошы, толькі б яна была.

А пакуль праблема застаецца, людзі будуць дабівацца яе вырашэння любымі даступнымі спосабамі, бо ў такую гарачыню заставацца без вады вельмі цяжка.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

КРАЛА Ў ДЗЯЦЕЙ

Узбуджана крымінальная справа супраць шэф-кухара адной са школ Слонімскага раёна.

Яна не дакладвала прадукты ў дзіцячы рацыён. Сума ўкрадзенага склала каля 50 тысяч рублёў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗНОЎ НЕ ПАШАНЦАВАЛА

Ужо не першы раз зазіраюць злодзеі ў куратнік жыхара Альбярціна П.

Вось і зноў гаспадар застаўся ажно без шасці курэй. Міліцыя вядзе праверку.

Валерый КАВАЛЕНКА

РАСЦЕ ЗЛАЧЫННАСЦЬ

Па лініі крымінальнага вышуку ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года за першае паўгоддзе бягучага года злачыннасць на Слонімшчыне вырасла на 28,2%.

На Дзятлаўшчыне яна павялічылася на 11,5 %, а на Зэльвеншчыне — ажно на 126 %. А вось на Мастоўшчыне яна паменшылася на 6,8 %.

Сяргей ЧЫГРЫН

НЕ СПІЦЕ П'ЯНЫМІ КАЛЯ РЭЧКІ

Прыняўшы добрую дозу алкаголю, адзін слонімец выравшыў адпачыць каля Шчары непадалёк ад магазіна "Лета".

Як на бяду міма праходзіла кампанія з трох хлопцаў. Двое з іх раней былі судзімыя. Нядоўга разважаючы, троіца збіла п'янага, да таго ж, з небаракі знялі гадзіннік, красоўкі, залаты ланцужок.

Міліцыя аператыўна адшукала злодзеяў. Па факту разбойнага нападу ўзбуджана крымінальная справа.

Валерый КАВАЛЕНКА

ЗДАРЭННІ

ТРЫ ЗНАЙШЛІ, АДЗІН УКРАЛІ

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Слонімскага РАУС за мінулы тыдзень знайшлі тры веласіпеды, што зніклі на дачы ў Хадзявічах, з двара ў Пятралевічах і ў жыхара Слоніма.

Устаноўлены таксама і асобы злодзеяў. У хадзявіцкім крадзяжы ўдзельнічалі мясцовыя падлеткі. У Слоніме веласіпед украў раней судзімы беспрацоўны мясцовы жыхар. А ў Пятралевічах захацеў паездзіць бомж.

А на мінулым тыдні ў Жыровічах веласіпед угналі з-пад інтэрната сельскагаспадарчага каледжа. Па гэтаму факту праводзіцца праверка.

Валерый КАВАЛЕНКА

ПАЧАЎСЯ МАКАВЫ СЕЗОН

Супрацоўнікі міліцыі затрымалі беспрацоўнага грамадзяніна Д. Пры сабе той меў наркатычнае зелле — мак — і шпрыцы.

Міліцыя высвятляе, дзе наркаман набыў сабе "кайф" і як ён збіраўся ім распараджацца.

Валерый КАВАЛЕНКА

НЕДАСТАЧА — ГЭТА НЕ ДРОБЯЗЬ

У магазіне "1 000 дробязей" працуе брыгада рэвізораў.

Справа ў тым, што ў магазіне выяўлены значны недахоп грошай за прададзеныя тавары. Яго памеры і асобы, вінаватыя ў недастачы, высвятляюцца.

Валерый КАВАЛЕНКА

ДАЕЗДЗІЎСЯ

Днямі супрацоўнікі слонімскай міліцыі затрымалі грамадзяніна Н., жыхара нашага горада.

Мужчына карыстаўся падробленымі дакументамі на права кіраванне аўтамабілем.

Застаецца высветліць, дзе гэтыя дакументы ён набыў.

Валерый КАВАЛЕНКА

ЗЛОДЗЕЯ АРЫШТАВАЛІ АЖНО Ў МІНСКУ

Зімой гэтага года адбыўся шэраг крадзяжоў на дачных пасёлках паблізу Слоніма.

Слонімская міліцыя доўгі час не магла выйсці на след злачынцы. А на мінулым тыдні ў Мінску быў затрыманы слонімец, які падазраецца ў тых крадзяжах.

Мужчына дастаўлены ў Слонім. Вядзецца следства.

Валерый КАВАЛЕНКА

П'ЯНЫ ВАЙСКОВЕЦ ЗА РУЛЁМ

У мінулую нядзелю ноччу п'яны вайсковец з Гродна ўпраўляючы легкавым аўтамабілем не справіўся з кіраваннем і стукнуўся ў дрэва і слуп на Першамайскай вуліцы ў Слоніме.

У выніку сутыкнення ніхто з пасажыраў не пацярпеў, а вось "Мерседэс" патрабуе сур'ёзнага рамонту.

Сяргей ЧЫГРЫН

ДЗЯЎЧАТЫ ТРАПІЛІ ПАД КОЛЫ

Жанчына, якая ўпраўляла аўтамабілем, збіла дзвюх 17-гадовых дзяўчат з Альбярціна.

Дзяўчаты з траўмамі дастаўлены ў бальніцу. Вядзецца праверка.

Сяргей ЧЫГРЫН

РЭПАРТАЖ

Фабрыку яек сцерагуць буслы



Дзмітрый Зайкоўскі

Днямі рэдакцыя "ГС" атрымала ананімны ліст, у якім аўтар бэсціў новага дырэктара Слонімскай птушкафабрыкі. За апошнія два гады на гэтым прадпрыемстве змяніўся ўжо чацвёрты кіраўнік. У лютым 2002 года выконваючым абавязкі дырэктара птушкафабрыкі быў прызначаны галоўны інжынер прадпрыемства 35-гадовы Дзмітрый Зайкоўскі. У хуткім часе па горадзе папаўзлі чуткі пра яго жорсткі стыль кіравання, а на фабрыку зачасцілі камісіі з праверкамі.

Ад "элітнага" прадпрыемства да рынкавых праблемаў

Наша знаёмства з птушкафабрыкай пачалося з кабінета дырэктара. Пачакаўшы хвілін дзесяць, пакуль гаспадар уладзіць тэрміновыя службовыя справы са сваімі работнікамі, якія чакалі ў прыёмнай, мы былі запрошаныя ў кабінет. Дзмітрый Іванавіч ахвотна ўключыўся ў размову.

Экскурс у гісторыю атрымаўся нядоўгім, але змястоўным.

Птушкафабрыка была ўтворана ў 1965 годзе як міжраённае сельгаспрадпрыемства. Паступова ішло будаўніцтва і расшырэнне вытворчасці, асноўны прадукт якой — яйкі. У пачатку 80-ых гадоў мінулага стагоддзя адбылася рэканструкцыя фабрыкі, і на сённяшні дзень яна мае 8 птушнікаў, максімальная загрузка якіх — 200 тысяч курэй-нясушак. Рэальна ж утрымліваецца 120 тысяч нясушак. У адным з птушнікаў цяпер ідуць работы па пераабсталяванню — устанаўліваецца тэхналагічная лінія нямецкай вытворчасці з камп'ютэрным забеспячэннем.

У былыя часы на птушкафабрыцы працавала 150 чалавек, і гэта было своеасаблівае "элітнае" прадпрыемства ў горадзе, дзе работнікі атрымлівалі зарплату па 400 і больш савецкіх рублёў у месяц. Гарантаваная запатрабаванасць тавару доўгі час не выклікала вялікага галаўнога болю ў кіраўніцтва прадпрыемства. Але калі савецкая імперыя перастала існаваць, у Беларусі снежным камяком нарасталі праблемы ў розных галінах эканомікі. І перыяд таптання на месцы з пачатку 90-х і да 2000 года для птушкафабрыкі на карысць не пайшоў.

У 2000 годзе, калі сітуацыя на прадпрыемстве пагоршылася, пачалі змяняцца кіраўнікі. І калі ў лютым 2002 года выконваць абавязкі дырэктара пачаў Дзмітрый Зайкоўскі, то першае, што, па яго словах, прыйшлося вырашаць — гэта забяспечыць птушку кармамі і купіць паліва. На той час куры галадалі, а работніцы яйкасклада, якія выконваюць ручную працу па сартаванню яек, атрымлівалі па 40 – 60 тысяч рублёў у месяц.

Каб вывесці прадпрыемства з крызісу, новы кіраўнік павёў на фабрыцы палітыку жорсткай эканоміі, зарплату пачалі налічваць, па-магчымасці, па факту выкананай працы, а не за праседжаныя гадзіны, і, галоўнае, быў наладжаны жорсткі кантроль за рэалізацыяй прадукцыі і працоўнай дысцыплінай.



Буслянка на воданапорнай вежы

На пытанне: "Хто вас так не любіць, што піша ананімкі і абвінавачвае ў смяротных грахах?" — Дзмітрый Зайкоўскі адказаў коратка: "Тыя, хто раней атрымліваў "левымі" па 300 – 400 даляраў у месяц.". Па словах дырэктара, з зімы бягучага года па розных прычынах, у тым ліку і з-за службовай неадпаведнасці фабрыку пакінулі больш як 30 чалавек. З іншага боку, сярэдняя зарплата штомесячна расла і за травень склала 200 тысяч рублёў, а работніцы таго ж яйкасклада, для прыкладу, зарабляюць, у сярэднім, па 250 тысяч рублёў. Затрымка выплаты заробку і іншых плацяжоў складае не больш месяца. На фабрыцы цяпер працуюць 97 чалавек. Як сцвярджае дырэктар, засталіся працаваць тыя, хто добра ведае сваю справу і разумее, што яго заробак залежыць ад выніку працы ўсяго прадпрыемства. Пры гэтым, скарачэння штатаў не праводзілася, а была палепшана арганізацыя самой працы. Так, з работай, якую раней выконвалі 17 –15 вадзіцеляў, цяпер спраўляюцца 7 – 8. І яны зацікаўленыя ў тым, каб тэхніка спраўна працавала, бо ад гэтага залежыць іх заробак.

Малады дырэктар, які дасканала ведае сваю гаспадарку і калектыў — шэсць гадоў на пасадзе галоўнага інжынера не прайшлі дарэмна, — за адносна кароткі прамежак часу здолеў вярнуць фабрыцы страчаную стабільнасць. Загадам міністра ад 1 ліпеня бягучага года Дзмітрый Зайкоўскі зацверджаны на пасадзе дырэктара Слонімскай птушкафабрыкі. Але, як падкрэсліў сам Дзмітрый Іванавіч, на сённяшні дзень, седзячы ў кабінеце, вялікіх вынікаў не дасягнеш.

Буслы сцерагуць курэй

На 10 га зямлі, практычна за горадам, размяшчаецца Слонімская птушкафабрыка. У вочы кінулася чысціня на тэрыторыі і прывабны выгляд будынкаў. А яшчэ — буслянка з сямействам буслоў на воданапорнай вежы, крыху недафарбаваная ў самым версе. Як патлумачыў дырэктар, не даў дафарбаваць бусел — цюкнуў маляра дзюбай па галаве.

Спачатку мы заглянулі на яйкасклад. Там жанчыны сартуюць, расфасоўваюць і адгружаюць гатовую прадукцыю. Адсюль яна паступае ў Слонімскі, Зэльвенскі, Дзятлаўскі, часткова Ваўкавыскі раён і ў Мінск — гэта ўнутраны рынак збыту, а 40% ад агульнай колькасці прадукцыі забірае Масква.

Недахопу ў спажыўцах, па словах дырэктара, няма, і яйкі на складзе не залежваюцца. Актуальным застаецца паляпшэнне якасці прадукта і расшырэнне вытворчасці. Таму для аднаго з птушнікаў было набыта сучаснае нямецкае абсталяванне, разлічанае на 20 гадоў працы. Айчынная ж тэхналагічная лінія "жыве" 8 гадоў, і яна далёкая ад сучасных тэхнічных стандартаў. Так сцвярджаюць спецыялісты. Калі ж мы зайшлі ў птушнік №6, дзе нясуць яйкі 35 тысяч курэй, а абслугоўваюць увесь працэс дзве жанчыны-птушніцы і адзін слесар-апаратар — гэта зрабіла на нас пэўнае ўражанне. Прызнацца, чакалася пачуць там пэўны спецыфічны пах курятніка, але сістэма вентыляцыі працуе спраўна, а "рэшты вытворчасці" прыбіраюцца своечасова. Яйкі (без слядоў памёту) ад клетак нясушак па транспарцёрнай лініі перамяшчаюцца да яйказборнікаў. Вада і корм птушцы падаюцца таксама аўтаматычна. Карацей кажучы, убачыць давялося сапраўды фабрыку, а не куратнік. І гэтая фабрыка яек на сённяшні дзень займае па вытворчых паказчыках першае месца сярод 10-ці профільных прадпрыемстваў Гродзеншчыны і восьмае (з 70-ці птушкафабрык) у краіне.

А яшчэ нядаўна слонімскія вытворцы яек былі апошнімі ў гэтым спісе.

На традыцыйнае пытанне, што сёння дапамагае і што перашкаджае працаваць кіраўніку прадпрыемства, Дзмітрый Зайкоўскі адказаў наступнае: "Дапамагаюць у працы веданне сваёй справы і эканомія, а перашкаджаюць памылкі мінулых гадоў. І моцна падкасіла птушкагадоўлю ўвядзенне 20% падатку на дабаўчаную вартасць. А ў будучым, — перакананы дырэктар Слонімскай птушкафабрыкі, — ва ўмовах рынку выжыве мацнейшы, той, хто будзе лепш працаваць". Пры гэтым Дзмітрый Зайкоўскі ўпэўнены, што яго прадпрыемства выжыве.

Гледзячы на буслінае гняздо, з якога, здавалася, гэтыя беларускія птушкі пільным вокам сочаць за парадкам на фабрыцы, успомнілася народная прыкмета — у дрэннага гаспадара бусел ніколі гняздо не саўе.

Мікола КАНАНОВІЧ,
Вольга ШЫНКЕВІЧ (фота)



Адгрузка гатовай прадукцыі

НАВІНЫ

КНІЖКА ПРА ЖЫВЫЯ ЛІТАРЫ



У выдавецтве "Народная асвета" выйшаў з друку дапаможнік для настаўнікаў падрыхтоўчых класаў "Жывыя літары". Яго аўтарам з'яўляецца наш зямляк — пісьменнік Аляксей Якімовіч, а складальнікам кнігі — педагог з Гродна Зоя Тамашэвіч.

У дапаможніку сабраны багаты літаратурны матэрыял на кожную літару алфавіта. Ён складаецца з чатырох частак: загадкі, скорагаворкі або чыстагаворкі, вершы беларускіх паэтаў, апавяданні і казкі-гульні пра літары. Менавіта аўтарам казак-гульняў і апавяданняў, якія змешчаны ў кнізе, з'яўляецца Аляксей Якімовіч. Героямі яго твораў выступаюць птушкі, звяры, літары, якія размаўляюць, спрачаюцца, здзяйсняюць розныя ўчынкі, з якімі адбываюцца неверагодныя здарэнні. У апавяданнях дзеці гуляюць са словамі і літарамі, пішуць, чытаюць і складаюць.

Пазнаёміўшыся з гэтымі творамі, настаўнік сам вырашыць, чытаць іх у класе поўнасцю ці часткова, якое менавіта заданне даць дзецям і г. д. Таму хочацца спадзявацца, што кніжка "Жывыя літары" стане карысным дапаможнікам у рабоце настаўнікаў пачатковых класаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

"ГОЛАС БЕЛАРУСАЎ" СА СЛОНІМА

Новая маладзёжная ініцыятыва ўзнікла нядаўна ў Слоніме. Сябры новастворанага грамадска-палітычнага згуртавання "Голас Беларусаў" ставяць сваёй мэтай дапамагчы ў пашырэнні свядомасці ўладаў і грамадства наяўнасць існуючых у нашай краіне праблем.

У пачатку ліпеня "Голас Беларусаў" разам з сябрамі творчага маладзёжнага аб'яднання "Вятрак" (гэтая ініцыятыўная група таксама пакуль не зарэгістраваная) звярнуліся да ўладаў Слоніма з прапановай ліквідаваць недахоп сметніц у людных месцах горада і ў прыватнасці – ля Лабазоўскага вадасховішча. Маладзь звяртае ўвагу чыноўнікаў на тое, што гэтую праблему трэба вырашыць да восені, бо "мы не жадаем бачыць наш горад у забруджаным выглядзе ў яго юбілей."

Вітаўт РУДНІК

ЗАВЯРШЫЎСЯ ТЭАТРАЛЬНЫ СЕЗОН

У Слонімскім беларускім драматычным тэатры завяршыўся чарговы тэатральны сезон.

Калектыў тэатра праз тры дні пойдзе ў водпуск. А напрыканцы жніўня зноў сустрэнецца ў сценах роднай установы культуры.

У гэтыя дні са спектаклем "Залатое куранё" знаёміцца дзеткі школьных лагераў Слонімшчыны, Зэльвеншчыны і Дзятлаўшчыны. А ў тэатральным партфелі на наступны сезон юных і дарослых гледачоў чакаюць п'есы бела рускіх і замежных драматургаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

ЛЕТНІЯ КАРАН-КУРСЫ

Пры Слонімскай мячэці дзейнічаюць летнія каран-курсы па вывучэнню арабскай мовы.

Гэтыя курсы наведваюць слонімскія дзеці ва ўзросце ад сямі гадоў і старэйшыя.

Сяргей ЧЫГРЫН

КАРЭЛІЧЫ

МІРСКАМУ ЗАМКУ ЎРУЧАНА ПАСВЕДЧАННЕ ЮНЕСКО

10 ліпеня ў мястэчку Мір Карэліцкага раёна пабываў генеральны дырэктар ЮНЕСКО Каіціра Мацуура.

У прысутнасці кіраўнікоў беларускага ўрада ён уручыў Пасведчанне аб уключэнні Мірскага замка ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны.

Каіціра Мацуура таксама прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця ў Мінску Нацыянальнага цэнтра інфармацыі і дакументацыі ЮНЕСКО і іншых міжнародных арганізацый пры Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

У планах супрацоўніцтва Беларусі і ЮНЕСКО таксама рэалізацыя праекта захавання біялагічнай разнастайнасці балотаў Палесся.

Міхась ВАСІЛЕВІЧ

ВОЛКОВЫСК

ДРЕВНИЙ ВОЛКОВЫСК ОТПРАЗДНОВАЛ ДЕНЬ ОСВОБОЖДЕНИЯ.

14 июля 58 лет тому назад части 40-го стрелкового корпуса третьей армии второго Белорусского фронта после ожесточенных боев освободили город от немецко-фашистских оккупантов.

В этот день на стадионе педагогического колледжа состоялся торжественный митинг и праздничный концерт, посвященный этой дате.

Александр ДАНИЛИН

ВЫСТАВКА МЕСТНОГО ХУДОЖНИКА

15 июля в районном центре ремесел в городском поселке Рось открылась выставка члена Союза художников Беларуси Станислава Кузьмара "Волковыск в начале XX столетия".

На ней было представлено 15 картин художника, изображающих улицы и здания города в прошлом.

Александр ДАНИЛИН

ЭКОНОМИКА ПРИВЛЕКАЕТ, А ЗООТЕХНИЯ ТЕРЯЕТ ПРЕСТИЖ

Второй год Волковысский сельскохозяйственный техникум принимает учащихся по специальности "экономика и организация на предприятиях АПК" со сроком обучения два года и 10 месяцев.

В этом году набор увеличился вдвое и составил 50 человек. А вот набор по специальности "зоотехния" сократился с 75 до 50 человек.

Александр ДАНИЛИН

НЕ ОБОШЛОСЬ БЕЗ ПРОИСШЕСТВИЙ

В карьере городского поселка Красносельский во время купания утонул 18-летний парень, работавший на местном предприятии "Стройматериалы".

В этом же поселке водитель автомобиля "Форд-Эскорт" в состоянии алкогольного опьянения не справился с управлением и совершил наезд на забор по улице 17 сентября. Повредил его на протяжении шестнадцати метров и "въехал" в частный гараж, который находился в семи метрах от забора.

Александр ДАНИЛИН

ЭКОЛОГИЯ

Наш мусор нас же УБИВАЕТ

По данным лабораторий санэпидемслужбы Беларуси, уже сегодня почти 10 процентов почв республики находятся в зоне загрязнения промышленных предприятий и транспортных магистралей, а также в местах применения пестицидов и содержат повышенные концентрации солей тяжелых металлов (чем это нам грозит, расскажем несколько ниже). Об этом сообщил заместитель главного санитарного врача Беларуси Владимир Зенькевич.



Так выглядит современная белорусская свалка — полигон бытовых отходов

Поэтому приоритетным направлением в работе по уменьшению вредного влияния отходов на здоровье населения и окружающую среду должно являться сокращение объемов образования отходов и повышение уровня их переработки. И это, действительно, проблема. Удельный годовой выход твердых бытовых отходов (ТБО) на одного жителя современного города составляет 250-700 кг. В развитых странах эта величина ежегодно вырастает на 4-5 %, что втрое превышает рост населения.

И не случайно вопросы переработки, утилизации бытовых отходов становятся все более актуальны. Возможно, кому-то все это покажется несерьезным. Тогда рассмотрим подробнее влияние хранения, "консервации" бытовых отходов на природную среду и человека. Казалось бы, лежат себе отходы на свалках, и пусть себе лежат. Нам от этого, вроде бы, хуже не становиться; и кроме засорения и захламления земли ничего не наблюдается. Но это не так.

Все эти кучи мусора подвергаются естественному старению под воздействием светопогоды. Старение химических материалов бытовых отходов, содержащих мышьяк, серу, хлор, бром, тяжелые металлы кадмий, свинец, медь вызывает постепенное, медленное, незаметное отравление почвы. К примеру, разбросанные и разбитые аккумуляторные батареи, содержащие соли свинца, при старении в первую очередь отравляют почву и водоемы. А ведь тяжелые металлы обладают канцерогенными и мутагенными свойствами. И это означает, что брошенные отходы из цветного металла, сломанная ложка, разбитая аккумуляторная батарея в конечном итоге через несколько лет может вызвать через ближайший водоем, из которого мы поливаем огород, у нас, у нашего ребенка, у нашего внука, после длительного воспалительного процесса в желудке или в печени, злокачественную опухоль, рак. В этом заключается канцерогенность тяжелых металлов. Кроме того, эти же металлы могут оказать на наших потомков мутагенное воздействие. Ребенок может родиться без пальца, без кисти или с еще каким-либо уродством. Кто будет в этом виноват? Да мы же с вами и будем виноваты.

Но кроме нас есть еще и специальные коммунальные службы, на которые возложена обязанность нейтрализовывать бытовые отходы, за что, кстати, мы исправно платим. В основном, коммунальщики занимаются вывозом мусора на свалки — полигоны твердых бытовых отходов. В настоящее время подобные полигоны имеет каждый город и районный центр в Беларуси. Однако, не решена проблема сбора и складирования отходов в сельской местности. По словам главврача Слонимского районного центра гигиены и эпидемиологии Анатолия Тепина, в нашем районе под мини-полигоны ТБО выделено 86 мест. Но эксплуатируются они с нарушениями, поскольку на благоустройство необходимы определенные затраты, а денег, как обычно, нет. Да и само содержание полигона подчиняется совершенно конкретным санитарным правилам и нормам, выполнять которые не всегда удается.

Вот и создает население стихийные свалки неподалеку от своих домов. Причем, не только на селе, но и в городе. В Слониме, как пример, Анатолий Михайлович Тепин назвал район Рыщицы, ближе к лесу, где люди устроили свалки. И не пугают их штрафы и административные протоколы, которых только в этом году составлено уже около ста. Несанкционированное, стихийное складирование твердых бытовых отходов без учета требований и приемов экологической биотехнологии приводит к выделению вредных химических и биохимических компонентов. Растворы этих компонентов, распространяясь, загрязняют почвенный слой, попадают в грунтовые воды, а затем в открытые водоемы.

Особенно опасны эти несанкционированные свалки, содержащие пищевые отходы, в жаркое, сухое время года. При температуре более 25 градусов создаются условия для интенсивного развития и распространения опаснейших инфекционных заболеваний холеры и чумы. При плюсовой температуре, начиная с апреля, в бытовых отходах в огромном количестве начинают размножаться мухи и грызуны всех видов. Переносу заболеваний способствуют и размножившиеся в большом количестве крупные птицы, в первую очередь вороны. А вы заметили, что вороны, галки стали преобладать на улицах Слонима, вытесняя воробьев и голубей?

В общем, решение вопросов санитарного состояния и благоустройства оставляет желать лучшего. И связано это, в первую очередь, с ухудшением материально-технической базы предприятий жилищно-коммунального хозяйства. Повсеместно, в том числе и в Слониме, отмечается недостаток спецавтотранспорта и горюче-смазочных материалов, изношенность техники, нехватка контейнеров для сбора мусора. Эта тема не сходит со страниц местной прессы: с печальным постоянством читатели жалуются на "благоухающие" под окнами контейнеры с мусором.

И при всем при этом, республиканской программой обращения с коммунальными отходами и в рамках мероприятий по санитарной очистке городов предполагается установить контейнеры для раздельного сбора мусора: пластика, стекла, органики. Но в настоящее время подобная система действует только в Лиде.

Интересен в этом плане опыт западных стран, где система раздельного сбора отходов действует уже достаточно давно. Недаром когда-то ходил наполовину анекдот, наполовину — правда, что японцы хотели выкупить за огромные деньги в Советском Союзе свалки. Так вот, возьмем пример наших восточных соседей. Во Владимирской области были проведены расчеты, результат которых показал следующее. При разумной переработке бытовых отходов — в городе Владимире это 540 000 метров кубических в год — можно получить до 60 тысяч тонн биологической массы — компоста, — в качестве экологически чистого природного органического удобрения для всех видов почв. Плюс к этому еще — до 12 тысяч тонн стеклоизделий, до 11 тысяч тонн железа и железных изделий и около 7 тысяч тонн пластмасс и изделий из них. Когда-нибудь и Беларусь придет к такому разумному использованию бытовых отходов, вместо того, чтобы отравлять ими себя и окружающую нас природу.

Ольга ОСИПЕНКО, Валерий КОВАЛЕНКО

ГРОДНА

ПАГАДНЕННЕ АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

У Гродне падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскай вобласцю і Падляскім ваяводствам, якія ўваходзяць у Еўрарэгіён "Нёман".

Свае подпісы пад дакументам паставілі старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Аркадзь Карпуць і маршалак сейміку Падляскага ваяводства Славамір Згжыва.

Пагадненне прадугледжвае сталыя кантакты суседзяў у галіне адукацыі, культуры, спорту і турызму.

Дэлегацыя сейміку Падляскага ваяводства наведала гродзенскую сярэднюю школу нумар 36 (з польскай мовай навучання) і сельскагаспадарчае калектыўнае прадпрыемства "Абухава" Гродзенскага раёна.

Міхась ВАСІЛЕВІЧ

СІТУАЦЫЯ НА БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАЙ МЯЖЫ

У Гродне адбылося пятае пасяджэнне беларуска-польскай міжурадавай каардынацыйнай камісіі па справах транспамежнага супрацоўніцтва.

Дэлегацыі ўзначальвалі намеснік міністра замежных спраў Беларусі Аляксандр Міхневіч і намеснік міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі Польшчы Зянон Касіняк-Камыш. На прэс-канферэнцыі для журналістаў яны падкрэслілі, што імкнуцца захаваць стабільную сітуацыю на беларуска-польскай мяжы. Абодва бакі ўлічваюць тое, што Польшча рыхтуецца да ўваходу ў Еўрасаюз і уводзіць праз год візавы рэжым для грамадзян Беларусі. Як заявіў З.Касіняк-Камыш, "мы не выдумалі ў Польшчы візавы рэжым. Такое патрабаванне — у сувязі з Шэнгенскім пагадненнем." Каб аблегчыць паездкі грамадзян Беларусі ў Польшчу, будзе практыкавацца выдача віз на 5 гадоў. Пры гэтым кошт іх будзе па магчымасці танным.

Аляксандр Міхневіч падкрэсліў, што "расходы на ўтрыманне консульскіх устаноў будуць цяжкім грузам для бюджэтаў Беларусі і Польшчы". Але зарабляць на візах ніхто не збіраецца.

Міхась ВАСІЛЕВІЧ

МАСТЫ

ГУСКА-ВЕТЭРАН

У вёсцы Дзенькаўца ў сям'і Лапатаў жыве гуска, якая мае 21 год.

Яе пакінула жыць гаспадыня, калі жаніла сына Анатоля. Астатнія гусі былі пададзены на вясельны стол.

Язэп ПАЛУБЯТКА

НЁМАНСКАЯ ТРАГЕДЫЯ

Ля вёскі Лунна падчас купання ў Нёмане патануў дванаццацігадовы хлопчык.

Антон МАКЕЙ

УТОЧНЕНИЕ

В заметке «Новые налоги и новые проблемы» ("ГС" №27 от 4-10 июля) была допущена неточность. В частности, сбор за право торговли в размере 10 базовых величин (100 тысяч рублей) будет взиматься не ежемесячно, как было написано, а одноразово. То есть, юридическое лицо или предприниматель, получившие в исполкоме разрешение на установку павильона, киоска, палатки, лотка и других объектов мелкорозничной торговли, обязаны уплатить сто тысяч рублей 22 числа следующего месяца.

Газета Слонімская
18 — 24 ліпеня 2002г. №29 (267)

ЗЭЛЬВА

ПРАСІЎ НІКОГА НЕ ВІНАВАЦІЦЬ

Жыхар вёскі Самаравічы Зэльвенскага раёна скончыў жыццё самагубствам.

Як паведамілі карэспандэнту "ГС" у раённай пракуратуры, 52-гадовы мужчына засіліўся ў камарцы свайго дома. Перад смерцю ён пакінуў запіску, у якой прасіў нікога ў яго самагубстве не вінаваціць.

Наталля ГЛУШЭНЯ

СПАБОРНІЦТВЫ ПА ПАЖАРНА-СТРАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

У Ваўкавыску адбыліся занальныя спаборніцтвы па пажарна-страявой падрыхтоўцы сярод каравулаў аддзелаў па надзвычайных сітуацыях Гродзенскай вобласці.

Каманда Зэльвенскага раёна заняла трэцяе месца.

Наталля ГЛУШЭНЯ

УРАЧЫСТАСЦЬ З НАГОДЫ ВЫЗВАЛЕННЯ ЗЭЛЬВЫ

У Зэльве, каля помніка загінуўшым воінам у Вялікай Айчыннай вайне, прайшоў мітынг, прысвечаны вызваленню мястэчка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Затым у мясцовым РДК адбылася канцэрт, а позна вечарам над пасёлкам — салют.

Наталля ГЛУШЭНЯ

АБЫШЛОСЯ БЕЗ АХВЯР

За другі квартал бягучага года па Зэльвенскім раёне зарэгістранава сем пажараў.

Усе пажары адбыліся ў сельскай мясцовасці. Як паведамілі карэспандэнту "ГС" у Зэльвенскім аддзеле па надзвычайных сітуацыях, асноўнымі прычынамі пажараў з'яўляюцца звычайныя невыкананні правілаў пажарнай бяспекі. Напрыклад, у вёсцы Краняніца з-за парушэння правілаў мантажу электраправодкі загарэўся хлеў. А няправільная эксплуатацыя газавай канструкцыі прывяла да загарання жылога дома ў вёсцы Залацеева. На шчасце, абышлося без чалавечых ахвяр.

Наталля ГЛУШЭНЯ

ПЕРШЫ КРЭМІРАВАНЫ Ў ЗЭЛЬВЕ

Жыхар Зэльвы Я. паехаў на заробкі ў Расію і там памёр.

Паколькі транспарціроўка цела на Радзіму выклікала пэўныя цяжкасці, сваякі памерлага вырашылі крэміраваць цела.Такім чынам родныя перавезлі прах мужчыны ў Зэльву і пахавалі.

Наталля ГЛУШЭНЯ

МАСТЫ

ВЫБЕГ НА ШАШУ

Насупраць раённай бальніцы з-за аўтобуса выбег дзесяцігадовы хлопец і патрапіў пад легкавік.

Шафёр паспеў своечасова адрэагаваць і спыніўся. Потым адвёз пацярпеўшага ў лякарню. На шчасце, пашкоджанні былі нязначныя.

Антон МАКЕЙ

50 ТЫСЯЧ НА ПЛОТ

У Мастах ля каталіцкага храма пастаўлены плот з літых металаканструкцый.


Грошы на яго сабралі вернікі. Кожная сям'я выдаткавала прыкладна па 50 тысяч рублёў.

Антон МАКЕЙ

МЕДЫЦЫНА

Чароўныя іголкі ДОКТАРА ЛІ

Да яго загадзя запісваліся на прыём, як да знакамітага прафесара. Людзі ехалі ў Дзятлава з усіх куткоў Савецкага Саюза, жылі ў гасцініцы, наймалі кватэру, каб толькі палячыцца ў доктара Лі, які пазбаўляў ад шматлікіх хвароб пры дапамозе іглarэфлексатэрапіі: ад радыкуліта, неўрастэніі, галаўных боляў, мігрэні і многага іншага.


Фота Віталя ГІЛЯ

86-гадовы доктар Лі

90 працэнтаў хворых пасля яго сеансаў адчувалі сябе выдатна. Кожны дзень Павел Пятровіч Лі прымаў па 30-35 чалавек. Па майстэрству, душэўнасці, чуласці яму не было роўных.

Шлях да прызнання быў доўгім і нялёгкім. Павел Пятровіч па нацыянальнасці карэец. Яго бацькі некалі пераехалі жыць у Расію, на Далёкі Усход. Там ён і нарадзіўся. Да Вялікай Айчыннай вайны закончыў чатыры курсы медыцынскага інстытута ў Растове-на-Доне. Калі пачалася вайна, яго накіравалі ў Казахстан, дзе знайшлі прытулак тысячы эвакуіраваных. Малады доктар без дыплома лячыў іх і мясцовае насельніцтва.

Пасля таго, як разграмілі фашыстаў, вырашыў атрымаць дыплом урача. Менавіта з гэтай мэтай яны з сябрам і прыехалі ў Мінск. Паўла Лі прынялі на чацвёрты курс медыцынскага інстытута. І якім жа вялікім было здзіўленне, калі хлопец даведаўся, што тут выкладае прафесар, які вучыў яго ў далёкім Растове.

Павел Пятровіч хацеў лячыць туберкулёз і стараўся набыць добрыя веды. Гэта яму ўдалося ўпаўне, бо быў настойлівым і мэтанакіраваным. Таму, калі прыйшла пара размеркавання на працу, прапанавалі самому выбраць месца, дзе хацеў бы працаваць. Ён даведаўся, што ў Дзятлаўскім раёне ёсць санаторый "Наваельня", дзе можна прыкласці свае маладыя сілы і веды. Спачатку прыехаў, так бы мовіць, у разведку. Яму спадабаўся і пасёлак Наваельня, і сам санаторый. Вырашыў застацца тут. Было гэта ў далёкім 1956 годзе. Тут ён неўзабаве ажаніўся. Нарадзіўся сын. Тут і развёўся. Былая жонка цяпер жыве ў Кіеве, а сын — за мяжой.

Аднойчы доктар Лі паехаў у Крым адпачываць, і там яму прапанавалі работу. Вядома, Крым — не Наваельня, і Павел Пятровіч вырашыў пераехаць у казачны цёплы край. Але якраз у гэты час у Дзятлаве адкрывалася туберкулёзная бальніца, і ў райкаме партыі яму прапанавалі ўзначаліць калектыў, бо ўрачоў-фтызіятраў не хапала.

— Папрацуйце там хоць да Новага года, — угаворвалі доктара ў райкаме. І ён згадзіўся. Мінуў Новы год, потым і другі, і дзесяты, і дваццаты... Павел Пятровіч Лі назаўсёды застаўся ў Дзятлаве. Тут ён сустрэў сваё каханне, сваё шчасце. Лячыў маладую прыгожую настаўніцу. Вылечыў, а праз некаторы час яны пажаніліся. Ганна Леапольдаўна падарыла мужу сына і цудоўную дачушку Святланку, падобную да таты не толькі знешне, але і характарам — сціплая, чулая, спагадлівая.

У 1970 годзе разам з асноўнай работай ён пачаў займацца іглarэфлексатэрапіяй. У той час такіх спецыялістаў у рэспубліцы амаль што не было, а іголкі доктара Лі стваралі цуды. Добрая слава пра яго ляцела далёка.

— У каго вы навучыліся гэтай няпростай справе? — пытаю ў Паўла Пятровіча.

— Яшчэ ў дзяцінстве ад свайго бацькі. Ад многіх хвароб карэйцы лечацца іголкамі.

Мой бацька не быў дыпламаваным урачом, але рабіў гэта выдатна. Я б даўно заняўся такой практыкай, ды не давалі дазволу. Зразумела, што з гадамі многае забылася, і мне прыйшлося пачытаць нямала літаратуры, у асноўным, гэта былі медыцынскія кнігі і артыкулы ў перакладзе з карэйскай і кітайскай моў. Дзеля гэтага некалькі разоў ездзіў у маскоўскія бібліятэкі, быў у Маскве на курсах удасканальвання ўрачоў. І вось настаў той дзень, калі я змог прымяніць свае веды на практыцы. Радаваўся, што магу дапамагчы людзям, і яны едуць да мяне па гэту дапамогу з усіх куткоў вялікай краіны. Не ўсе хваробы паддаюцца лекам, і тады я наступаю на іх з іголкамі. Пры дапамозе іглarэфлексатэрапіі лечацца ўсе хваробы, акрамя хірургічных і тых, што па злой волі лёсу дасталіся чалавеку ў спадчыну ад продкаў.

У 1977 годзе Павел Пятровіч пайшоў на пенсію, але працягваў працаваць урачом у бальніцы і, вядома ж, лячыць людзей пры дапамозе сваіх чароўных іголак. Колькі жыццяў ён выратаваў, колькі тысяч чалавек пазбавіў ад пакут. На лячэнне да яго везлі нават маленькіх дзетак.

Сёлета шаноўнаму доктару Лі споўніцца 87 гадоў, але ён і цяпер займаецца сваёй любімай справай. На вялікі жаль, не ў тым аб'ёме, у якім раней.

— Бачу ўжо не так добра, — з сумам прызнаўся доктар-чараўнік. — І таму некаторыя хваробы лячыць не бяруся, такія, напрыклад, як розныя захворванні вачэй. Але ў многіх выпадках яшчэ дапамагаю людзям.

Павел Пятровіч задаволены, што яго справа будзе перададзена ў спадчыну: дачка Святлана закончыла медыцынскі інстытут, пяць гадоў жыла і працавала ў Амерыцы, а цяпер вярнулася на Радзіму, каб прадоўжыць тое, чым займаецца яе знакаміты тата. Зараз Святлана Паўлаўна жыве ў Мінску і неўзабаве пачне лячыць людзей пры дапамозе іголак.

Хто ведае, можа пройдзе час, і пра яе людзі будуць расказваць дзіўныя гісторыі, як расказваюць пра Паўла Пятровіча. А ён і сапраўды можа ствараць цуды. Мне апавядала адна знаёмая:

— Калі захварэла, пайшла ў паліклініку. Доктар прыпісаў таблеткі. Прыняла адну і праз некаторы час адчула недамаганне. Прапаў сон, апетыт, па ўсім целе разлівалася слабасць. Было такое ўражанне, што неўзабаве спыніцца сэрца. Што рабіць, куды кінуцца? Пазваніла доктару Лі і расказала пра сваю бяду.

— Зараз жа ідзіце да мяне, — параіў ён.

Доктар яшчэ не паспеў зняць свае чароўныя іголкі, а мне ўжо змарыў сон, стала так лёгка, як было хіба ў маладосці. Ішла дадому з адной думкай, каб толькі не ўпасці дзе на вуліцы і не заснуць, бо да гэтага не спала некалькі начэй запар. Рэшткі дня і ноч праляцелі як адно імгненне. Назаўтра пайшла на работу зусім здаровая, але, як і раіў Павел Пятровіч, прайшла поўны курс лячэння, разлічаны на дзесяць дзён. Мінула трынаццаць гадоў. Я адчуваю сябе выдатна. А ўсё дзякуючы чароўным іголкам доктара Лі.

— Ад мяне ўжо адмовіліся дактары, казалі, што лячэнне не прынясе карысці, — апавядала другая кабета. — А доктар Лі вылечыў. Уяўляеце, якое гэта шчасце для мяне і для маіх родных!

Не магу не сказаць яшчэ вось пра што: Павел Пятровіч вельмі прыстойны чалавек. Калі ведае, што дапамагчы не зможа, не бярэцца за справу. Аднойчы пазваніла з Мінска сястра: у яе вельмі моцна захварэў сын. "Запішы нас на прыём да доктара Лі". Я пазваніла Паўлу Пятровічу.

— Які дыягназ? — спытаў ён.

Я сказала.

— Не, тут я бяссільны, — з горыччу прамовіў доктар...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ДЗЯТЛАВА

АБРАБАВАЛІ МАГАЗІН

У вёсцы Капці Дзятлаўскага раёна невядомыя асобы разбілі вокны, праламалі аканіцы і залезлі ў краму.

Злодзеі ўкралі прадукты харчавання і прамысловыя тавары. Як стала вядома,магазін ніхто не вартаваў, а сігналізацыя не працавала.

А праз дзень у міліцыю з'явілася мясцовая жыхарка і прызналася, што крадзёж здзейсніла яна са сваім сужыцелем.

ДЗВЕ АВАРЫІ

Жыхарка Дзятлава паехала на ўласным аўтамабілі ў вёску Мядзвінавічы. Маладая жанчына не мела ні правоў , ні навыкаў кіравання аўтамабілем.

Не справіўшыся з кіраваннем, яна перакулілася на вясковай вуліцы і з цяжкімі цялеснымі пашкоджаннямі трапіла ў бальніцу.

Непаўнагадовы навучэнец, які вучыцца ў Жыровіцкім каледжы, а жыве ў вёсцы Руда Яварская Дзятлаўскага раёна, выехаў пакатацца на матацыкле "Іж-планета". Хлопец таксама не меў правоў і наехаў на дзяўчынку, якая пераходзіла вясковую вуліцу. З цяжкімі раненнямі дзяўчынку даставілі ў бальніцу.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

МАСТЫ

СТАЛІ ЭКАНОМІЦЬ ГАЗ

ААТ "Мастоўдрэў" мае амаль два мільярды рублёў запазычанасці за скарыстаны прыродны газ.

Каб хоць неяк зменшыць доўг, на прадпрыемстве распачалі ўкараненне новых тэхналогій. У цэху гнута-клееных дэталей была ўстаноўлена паракандэнсатарная сістэма бельгійскай фірмы "Амстронг".

За пяць месяцаў, дзякуючы гэтаму, было сэканомлена 30 тон газу.

Антон МАКЕЙ

СЦІПЛАЕ СВЯТА

У Мастах у суботу прайшлі ўрачыстасці з нагоды чарговай гадавіны вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Свята прайшло сціпла. На Савецкай вуліцы ля помніка Героя Савецкага Саюза Васіля Жукава быў вывешаны віншавальны плакат.

Кіраўніцтва раёна і прадстаўнікі ўстаноў і арганізацый усклалі кветкі, вянкі і разышліся.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ПАЧАЛОСЯ ПАЛЯВАННЕ НА ЛІСІЦЫ

Сёлета аматары збора лісіцаў з-за сухога надвор'я распачалі грыбны сезон з некаторым спазненнем.

Не благі прыбытак маюць не толькі тыя, хто збірае грыбы, але і тыя, хто іх перакупляе. Сёлета перакупшчыкі плацяць за кілаграм грыбоў па пяць-шэсць тысяч рублёў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

КАПАЮЦЬ І ЖНУЦЬ

На мінулым тыдні на мастоўшчыне распачалося жніво. Яго вядуць калгас "Дубна" і саўгас "Чарлёна".

Напрэрдадні ў саўгасе "Чарлёна" распачалі капаць раннюю бульбу. Яшчэ раней раннюю бульбу выкапаў арэндатар Мысліевец, хоць іншыя яго калегі не спяшаюцца рабіць гэта, бо цана на раннюю бульбу нізкая не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі.

Антон МАКЕЙ

ЗДОРОВЬЕ

ОТМЕЧЕНО УХУДШЕНИЕ ЗДОРОВЬЯ

В последнее время у жителей Беларуси наблюдается ухудшение основных показателей здоровья. Об этом на пресс-конференции сообщил главный государственный санитарный врач Валерий Ключенович.

Так, по его словам, отмечено сокращение средней продолжительности жизни на 8–13 лет у мужчин и на 5–8 лет у женщин, снижение рождаемости на 28,7 процента, рост инфекционной заболеваемости по отдельным видам инфекций, а также осложнение ситуации с распространением СПИДа. Кроме того, наблюдается рост смертности среди населения трудоспособного возраста. Специалист отметил, что в настоящее время 91,3 процента мужчин и 85,7 процента женщин трудоспособного возраста в стране имеют от одного до пяти основных поведенческих факторов риска: низкая физическая активность, курение, злоупотребление алкоголем, нерациональное питание и психологический стресс. При этом он подчеркнул, что лишь 10–15 процентов населения следуют рекомендациям по сохранению и укреплению здоровья, а в списке наиболее актуальных жизненных ценностей у жителей страны здоровье стоит на 8–9 месте. В связи с этим, по словам В.Ключеновича, необходимо развивать стратегию здравоохранения, включающую не только эффективную медицинскую помощь, но и действенную профилактику с акцентом на пропаганду здорового образа жизни.

Ольга ОСИПЕНКО

ОБЩЕСТВО

У БЕЛОРУСОВ БУДЕТ ЕЩЕ ОДИН ПАСПОРТ

"Экономика страны ежегодно недополучает около 15,8 млн. долларов США из-за отсутствия в обращении специального заграничного паспорта гражданина Беларуси", — заявил на пресс-конференции в Минске начальник управления паспортно-визовой службы МВД Беларуси Михаил Петюль.

Проблема связана с тем, что в общегражданском паспорте Беларуси ограниченное количество страниц, предназначенных для проставления штампов пограничного контроля.

По словам М.Петюля, больше всего страдают отечественные грузоперевозчики, "теряющие время и деньги на получение новых паспортов". Ежегодно, отметил он, подразделения управления паспортно-визовой службы МВД Беларуси производит замену 100 тысяч паспортов вследствие нехватки страниц для проставления штампов и отметок.

Общегражданский заграничный паспорт сможет получить любой желающий гражданин Беларуси. Со временем, отметил М.Петюль, он заменит разрешительную отметку на выезд за границу в паспорте, вопрос о конституционности которой рассматривает Конституционный суд страны по запросу Палаты представителей Национального собрания Беларуси.

В новом заграничном паспорте гражданина Беларуси отсутствуют сведения о семейном положении, поэтому, отметил М.Петюль, при семейных поездках за границу необходимо будет брать с собой и обычные ("внутренние") белорусские паспорта.

БелаПАН


ОБРАЗОВАНИЕ

ПЛАТА ЗА УЧЕБНИКИ УВЕЛИЧИТСЯ В 2 РАЗА

В новом учебном году в Беларуси будет увеличена плата за пользование школьными учебниками. Согласно постановлению правительства, она составит 50 процентов от общей стоимости комплекта учебников для учащихся подготовительных и 1—11 (12) классов, в то время как раньше родители оплачивали лишь 25 процентов стоимости книг.

Как сообщила БелаПАН начальник главного управления социально-экономического развития Министерства образования Беларуси Лидия Субботская, повышение платы за пользование учебниками вызвано финансовыми затруднениями, связанными с их изданием.

В новом учебном году самым дорогим станет комплект учебников для девятого класса белорусскоязычных школ — 19 тысяч 752 рубля. Родителям необходимо будет оплатить половину от этой суммы — 9 тысяч 876 рублей. За комплект учебников для девятого класса русскоязычных школ необходимо будет заплатить 6 тысяч 900 рублей. Комплект учебников для учащихся четвертого класса белорусскоязычных школ обойдется родителям в 9 тысяч 658 рублей при полной стоимости в 19 тысяч 316 рублей. А для четвертого класса школ с русским языком обучения стоимость комплекта учебников составит 18.018 рублей, за который придется платить соответственно 9.009 рублей. Как отметила Л.Суботская, разница в оплате русско- и белорусскоязычных учебников объясняется тем, что последние издаются только в Беларуси, а учебники на русском языке закупаются и в России.


Учиться, учиться, учиться

Фота IREX/ProMedia

В документе также отмечено, что от платы за использование учебников будут освобождены дети из семей, в которых совокупный доход на одного члена семьи в месяц за предыдущий год не превышает 80 процентов утвержденного бюджета прожиточного минимума в среднем на душу населения в ценах сентября 2001 года. Кроме того, пользоваться учебниками бесплатно смогут дети-сироты, оставшиеся без попечения родителей, дети-инвалиды, а также дети, в семьях которых один или оба родителя являются инвалидами. На 50 процентов будет снижена плата за использование учебников многодетным семьям (трое и более детей дошкольного и школьного возраста).

Ольга ОСИПЕНКО

БЕЛАРУСЬ-США

50 МИЛЛИОНОВ ДОЛЛАРОВ НА ПОДДЕРЖКУ ДЕМОКРАТИИ

"Акт о демократии в Беларуси", разработанный американским конгрессменом Кристофером Смитом, предусматривает выделение белорусским демократическим силам порядка 50 миллионов долларов США. Об этом в интервью белорусской службе радио "Свобода" сообщил Кристофер Смит, который также являлся руководителем делегации США в Парламентской ассамблее ОБСЕ.

"Мы не можем только говорить про демократию, мы должны вкладывать в это деньги, — считает К.Смит. — Люди в Беларуси заслуживают такое руководство, которое соответствует их надеждам. А Лукашенко — не тот человек".

Кристофер Смит считает, что президент США Джордж Буш подпишет "Акт о демократии в Беларуси" в качестве закона. "Президент очень решителен в вопросе демократизации и прав человека, — сказал К.Смит. — Он в ужасе от того, что он видит. Так же, как и Администрация президента, и Хельсинкская комиссия в парламенте видят ситуацию с правами человека, которые уничтожаются в Беларуси. Поэтому на сессии ПА ОБСЕ я поддержал резолюцию, чтобы Национальное собрание не представляло Беларусь, так как оно не было избрано народом. Выборы не были не только справедливыми, они... стали итогом неконституционной конституции". "Мы надеемся, — сказал К.Смит, — что будут демократичные и свободные выборы с участием оппозиции, с ее доступом к средствам массовой информации".


Это — не демонстрация оппозиции

Фота IREX/ProMedia

В числе наиболее важных пунктов Акта о демократии в Беларуси К.Смит отметил пункты, предусматривающие обеспечение свободы прессы. "Должна быть реальная оппозиция, которая может высказаться", — сказал он.

Комментируя белорусско-российские отношения, К.Смит сказал: "Я думаю, все больше и больше Лукашенко является причиной неловкости для правительства Путина. Он не воспринимается всеми, кто верит в демократию. Я думаю и надеюсь, что Россия сама сделает собственные шаги для открытости, гласности. Почему она должна связываться с самой брутальной и малоперспективной диктатурой в Европе? Она препятствует себе в политическом и другом смысле, поддерживая режим Лукашенко".

Наталья КУЛАГИНА

ЭКОНОМИКА

УРОЖАЙ БУДЕТ НИЖЕ ПРОГНОЗИРУЕМОГО

Как сообщил 9 июля, выступая по Белорусскому телевидению, заместитель министра сельского хозяйства и продовольствия Анатолий Рубаник, специалисты оценивают объем зерна на полях в пределах 5,9 — 6 млн. тонн. Между тем весной урожай ожидался на уровне 6,4 млн. тонн.

По словам А.Рубаника, в нынешнем году урожай зерновых будет "близким к прошлогоднему или даже выше". Замминистра заявил о необходимости провести уборочную кампанию с минимальными потерями.

Для справки: в 2001 году урожай зерновых в Беларуси составил 5,2 млн. тонн.

Дмитрий ВЛАСОВ

СКОЛЬКО В БЕЛАРУСИ ЭКОНОМИЧЕСКИ АКТИВНОГО НАСЕЛЕНИЯ

Численность экономически активного населения на конец мая составила 4,4 млн. человек, или 45% от общей численности населения республики.

В их числе 4,3 млн. человек (97,4%) заняты в экономике.

praca.by

КУЛЬТУРА

ЛІТАРАТУРНЫ ІНТЭРНЭТ-САЙТ

Як паведамляе агенства БелаПАН, з першага чэрвеня ў Беларусі афіцыйна адкрыты першы інтэрнэт-сайт, прысвечаны творчасці сучасных беларускіх літаратараў — www.litara.net. Стварылі гэты беларускамоўны сайт студэнты Янук Латушка і Аліса Бізяева.

Карыстальнікі інтэрнэту могуць пазнаёміцца з артыкуламі, інтэрв'ю, рэцэнзіямі на новыя кнігі і публікацыі сучасных беларускіх пісьменнікаў, а таксама даведацца пра навіны літаратурнага і культурнага жыцця краіны.

На сайце можна знайсці прозвішчы Адама Глобуса, Славаміра Адамовіча, Алеся Аркуша, Ганны Кісліцынай, Зміцера Вішнева, Лявона Вашко, Андрэя Хадановіча і іншых сучасных беларускіх літаратараў — болей за 20 аўтараў.

